6. НГАБ у Гародні. Ф. 41. В. 1. Спр. 28.
7. НГАБ у Гародні. Ф. 41. В. 1. Спр. 4.
8. НГАБ у Гародні. Ф. 41. В. 1. Спр. 5.

УДК 357. 23 (091) “1903/1917” (476.76)

# СЛУЖБОВЫЯ СТУПЕНІ ГАРАДЗЕНСКАГА ГУБЕРНСКАГА АГРАНОМА ПАЎЛА МІНКОВА (ДА 1917 Г.)

**Галубовіч В. У.**
УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт”
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Сярод асоб, якія на пачатку XX ст. актыўна працавалі на ніве паляпшэння сельскагаспадарчай культуры Гарадзеншчыны, пачэснае месца займае Павел Фёдаравіч Мінкоў, гарадзенскі Губернскі аграном у 1911-1915 гг. У адрозненне ад свайго знакамітага бацькі Тодара, паўнавартаснай біяграфіі П. Мінкоў пакуль не атрымаў. Пэўны аб’ём інфармацыі можна знайсці ў вікіпедычнай публікацыі, якая ўтрымлівае ўрыўкавыя і памылковыя звесткі, якія, у сваю чаргу, паходзяць з размешчаных у інтэрнэце крыніц [1]. Між тым архіўныя матэрыялы дазваляюць дадаць шмат невядомых дэталяў і ўдакладненняў да біяграфіі П. Мінкова. Прадстаўленыя у дадзеным артыкуле даныя ўзяты з асабістай справы П. Мінкова, якая захавалася ў архіве Гарадзенскай губернскай землеўпарадкавальнай камісіі (ГГЗК). Гэта справа дазваляе прасачыць этапы жыцця П. Мінкова да 1915 г. [2].

У даволі падрабязных “Фармулярных спісах”, якія захаваліся ў асабістай справе П. Мінкова, змешчана інфармацыя як службовага, так і асабістага характару. Нарадзіўся П. Мінкоў 17 (29) снежня 1873 г. Ён адносіўся да патомных дваран Херсонскай губерні, дзе меў радавы маёнтак Астапаўка (921 дзесяціна). У Кобрынскім павеце Гарадзенскай губерні П. Мінкову належалі маёнткі Горлавічы (339 дзесяцін) і Стэфанты (360 дзесяцін), якія адносіліся да так званай набытай уласнасці – *“благоприобретённые”*. Сямейнае становішча П. Мінкова выглядала так – жанаты з Аляксандрай Мікалаеўнай Хаблоўскай (дачкой стацкага саветніка), з якой меў дачку Вольгу, народжаную 1 лістапада 1901 г. Маёнтка за жонкай не было. Па веравызнанні П. Мінкоў, яго жонка і дачка былі праваслаўнымі [2, Арк. 26 адв.–27]. Цікава, што нідзе ў матэрыялах справы не згадваецца нацыянальнасць П. Мінкова – балгарын.

У “Фармулярных спісах” П. Мінкова адзначалася, што ён скончыў *“курс навук”* у Мікалаеўскай рэальнай вучэльні і здаў іспыт за *“курс дадатковага класа”* ў Пінскай рэальнай вучэльні. Пасля гэтага П. Мінкоў



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

адвучыўся ў Нова-Аляксандраўскім інстытуце сельскай гаспадаркі і лесаводства ды атрымаў дыплом *“агранома другога разраду”* [2, Арк. 26 адв.].

Уласна службовая дзейнасць П. Мінкова пачалася ў яшчэ адносна маладым узросце. З 15 лістапада 1903 г. загадам Віленскага, Ковенскага і Гарадзенскага генерал-губернатара яго прызначылі земскім начальнікам 5 участка Кобрынскага павета Гарадзенскай губерні. Наступнай прыступкай было наданне чыну калежскага рэгістратара за выслугу гадоў *“найвышэйшым”* загадам ад 8 лютага 1910 г. У тым жа годзе 23 жніўня за выслугу гадоў П. Мінкоў атрымаў чын губернскага сакратара [2, Арк. 27 адв.].

Прызначэнню П. Мінкова на пасаду Губернскага агранома Гарадзенскай губерні папярэднічаў шэраг службовых і ведамасных перамяшчэнняў. 30 верасня 1910 г. земскі начальнік 5-га участка Кобрынскага павета П. Мінкоў накіраваў на імя гарадзенскага губернатара прашэнне аб хадайніцтве з мэтай пераводу яго ў падпарадкаванне Галоўнай Упраўе Земляробства і Землекарыстання (ГУЗіЗ) з прызначэннем на пасаду ўчастковага агранома ў Кобрынскім павеце [2, Арк. 15]. 2 лістапада 1910 г. Галоўнаму кіраўніку ГУЗіЗ была накіравана просьба ад імя гарадзенскага губернатара аб пераводзе П. Мінкова. Пры гэтым паведамлялася, што П. Мінкоў *“адзін з лепшых земскіх начальнікаў губерні, маючы вышэйшую сельскагаспадарчую адукацыю і практычны досвед у справе аказання насельніцтву агранамічнай дапамогі, як вядомы землеўласнік, які вядзе ўзорную гаспадарку, з’яўляецца пажаданым кандыдатам на пасаду агранома ў Гарадзенскай губерні”*. Прычынай пераводу (*“змены роду службы”*) было тое, што П. Мінкоў як земскі начальнік актыўна і паспяхова ўдзельнічаў у развярстанні надзельнай цераспалосіцы сялян на сваім участку [2, Арк. 16]. Пасля атрымання дадатковых звестак кіраўніцтва ГУЗіЗ перавяло П. Мінкова, загадам ад 10 снежня 1910 г., на пасаду ўчастковага агранома, што было даведзена да губернатара 17 снежня [2, Арк. 16]. 23 снежня 1910 г. інфармацыя аб пераводзе была накіравана асабіста П. Мінкову, а 30 снежня – у Кобрынскую павятовую землеўпарадкавальную камісію, якая дадаткова інфармавалася аб тым, што на П. Мінкова ўскладаліся абавязкі загадчыка *“Тараканскага сельскагаспадарчага склада”* [2, Арк. 21, 22. 23].

Перавод у іншае ведамаснае падпарадкаванне азначаў звальненне П. Мінкова з пасады земскага начальніка 5-га участка Кобрынскага павета, што адбылося 31 студзеня 1911 г. У гэтым годзе ўжо 2 траўня за выслугу гадоў яму быў нададзены чын калежскага сакратара [2, Арк. 27 адв.]. 10 кастрычніка 1911 г. царскім загадам П. Мінкоў прызначаецца



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ

Пачэсным міравым суддзёй Кобрынскага павета на трохгадовы тэрмін [2, Арк. 32].

Неўзабаве, 1 снежня 1911 г., на падставе загада губернатара, П. Мінкоў прызначаецца *“губернскім аграномам Землеўпарадкавальнай камісіі Гродзенскай губерні”* [2, Арк. 29]. Новапрызначаны губернскі агране, відаць, не вытрымаў тэмпу кар’ерных поспехаў і быў вымушаны з 7 студзеня 1912 г. узяць адпачынак на 28 дзён для папраўкі здароўя [2, Арк. 34].

Змена месца працы і, адпаведна, пераезд у сталіцу губерні прымусілі П. Мінкова паклапаціцца аб сямейных справах. У траўні 1912 г. ён займаўся ўладкаваннем дачкі Вольгі ў Гарадзенскую Марыінскую жаночую гімназію [2, Арк. 35]. Цікава, што з гэтай нагоды быў падрыхтаваны спецыяльны “Фармулярны спіс” П. Мінкова, складзены ў траўні 1912 г. для прадстаўлення ў гімназію. У гэтым дакуменце былі дададзены звесткі не толькі пра службовыя перамяшчэнні і наданні ў 1911 г., але і важны пункт аб узнагародзе 25 сакавіка 1912 г. ордэнам Св. Станіслава 3-й ступені [2, Арк. 36–39]. Адметна, што за гэту ўзнагароду прыходзілася плаціць самому атрымальніку. П. Мінкоў за ордэн выклаў 15 рублёў [2, Арк. 40–42, 46].

На канец 1912 г. выпадае яшчэ адна падзея, якая павінна была паспрыяць службовым дасягненням П. Мінкова. 7 снежня 1912 г. царскім загадам быў уведзены спецыяльны *“знак адзнакі за працу ў галіне землеўпарадкавання”*. П. Мінкоў апынуўся ў ліку асоб, якія маглі прэтэндаваць на адзнаку, а губернскае начальства рэкамендавала яго кандыдатуру (і яшчэ дзвюх асоб). У характарыстыцы П. Мінкова адзначалася наступнае: *“Дзякуючы яго клопату і няспыннай энергіі пры Кобрынскай Землеўпарадкавальнай камісіі адчынены першы ў губерні сельскагаспадарчы склад, які дазваляе аказваць разнастайную дапамогу хутаранам. Узорным чынам [П. Мінкоў] арганізаваў і слушна вырашыў справу аказання аграмічнай дапамогі на ўчастках прыватных уласнікаў”* [2, Арк. 40–43]. На жаль, для губернскага агранома хадайніцтва было адхілена. 19 лістапада 1913 г. на імя гарадзенскага губернатара прыйшло паведамленне з ГУЗіЗ, дзе тлумачылася, што дэпартамент не мог хадайнічаць аб узнагародзе, паколькі гэта супярэчыла *“27 артыкулу Вышэй зацверджаных 1 жніўня 1898 года Узнагародных Правілаў”* [2, Арк. 51].

Аднак па нейкай прычыне, у “Фармулярных спісах” П. Мінкова, складзеных ў 1913 г. (адзін з іх датаваны 6 лістапада), было адзначана, што Губернскаму аграному пажалавана права на *“знак адзнакі за працу па землеўпарадкаванню”*. Не менш зразумелай выглядае справа з узнагародай П. Мінкова срэбным медалём *“на ўспамін 300-годдзя Царавання Дома Раманавых для нашэння на грудзях”* у 1913 г. У адным з



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

"Фармулярных спісаў" за 1913 г. аб узнагародзе ёсць згадка, у іншым – няма [2, Арк. 53 адв., 55 адв., 57 адв., 59 адв.].

Наступныя звесткі пра лёс кар'еры П. Мінкова паходзяць з копіі пратакола *"Журнала Гарадзенскай ГЗК"* ад 18 снежня 1914 г. На пасяджэнні губернскай землеўпарадкавальнай камісіі разглядалася пытанне, якое датычылася Губернскага агранома – аб *"пераводзе ў наступны класны чын за выслугу гадоў"*. Камісія, на падставе дзеючага заканадаўства, пастанавіла, што П. Мінкова належыць перавесці ў *"наступны класны чын Тытулярнага саветніка"*. Неабходныя дакументы, у тым ліку *"Кароткі спіс аб службе"* П. Мінкова, былі падрыхтаваны ў лютым 1915 г. Прадстаўленне (ад 24 лютага 1915 г.) было накіравана ў Дэпартамент земляробства ГУЗіЗ, адкуль на імя губернатара 10 сакавіка прыйшоў несуцяшальны адказ. Дырэктар дэпартамента інфармаваў, што П. Мінкоў, на падставе *"арт. 272 Служб. Прав."*, павінен атрымліваць чын тытулярнага саветніка па лініі Міністэрства Юстыцыі. Акрамя таго, кіраўніцтва ГУЗіЗ сцвярджала, што П. Мінкоў падпарадкоўваўся Дэпартаменту земляробства і меў чын губернскага сакратара, што не давала яму права на далейшы рост па гэтым ведамстве. Наступны чын яму магло даць толькі павышэнне на пасадзе Пачэснага міравога суддзі [2, Арк. 61–61 адв., 62–63 адв., 64].

Прапанаваны Дэпартаментам варыянт атрымання чына не быў адхілены. Пра гэта сведчыць запыт старшыні Гарадзенскага акруговага суда (ГАС) ад 10 красавіка 1915 г. (калі губернскія ўлады ўжо знаходзіліся ў Слоніме) у Гарадзенскую ГЗК адносна П. Мінкова. Старшыня ГАС спрабаваў даведацца аб магчымых зменах па службовай, сямейнай ці маёмаснай лініі і аб наяўнасці звестак пра дзяржаўныя і грамадскія ўзнагароды [2, Арк. 65–65 адв.]. З ГЗК старшыні ГАС 29 красавіка 1915 г. быў накіраваны *"Фармулярны спіс аб службе выконваючага абавязкі Губернскага Агранома"* П. Мінкова, складзены яшчэ 24 лютага 1915 г. [2, Арк. 66–67 адв.]. Але высланых звестак старшыні ГАС не хапіла, таму яшчэ раз 5 траўня 1915 г. ён прасіў у ГГЗК даць інфармацыю пра магчымае прадстаўленне П. Мінкова *"да ўзнагарод па ўрадавых ці грамадскіх установах"*. У адказ 31 траўня 1915 г. з ГГЗК было паведамлена, што ў 1915 г. П. Мінкова прадстаўлялі да ўзнагароды ордэнам Св. Ганны трэцяй ступені *"за выдатныя дасягненні"*, але хадайніцтва не было задаволена [2, Арк. 69–70 адв.].

На гэтым архіўная справа П. Мінкова абрываецца, што фармальна магло сведчыць пра тое, што ў 1915 г. яго службовая кар'ера была завершана. Сапраўды, пасля адыходу расійскіх войск з Гарадзеншчыны восенню 1915 г. пасада Губернскага агранома стала фікцыяй. Аднак у рэальнасці П. Мінкоў да 1 верасня 1917 г. заставаўся *"загадчыкам агранамічнай дапамогі насельніцтву Гарадзенскай губерні"*, працягваў



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

атрымліваць жалаванне. На момант ліквідацыі Гарадзенскай агранамічнай арганізацыі ён жыў у Ніжнім Ноўгарадзе і выконваў абавязкі ўпаўнаважанага па закупках фуражу для арміі ў Ніжагародскім раёне [3, арк. 5 адв.–6, 16].

Адносна далейшага лёсу П. Мінкова застаецца даволі шмат пытанняў, але, у любым выпадку, звесткі з асабістай справы з'яўляюцца самай поўнай і вычарпальнай крыніцай пра яго службовую біяграфію. П. Мінкоў зрабіў імклівую кар'еру, меў дзяржаўныя ўзнагароды, а губернскае начальства актыўна лабіравала яго кандыдатуру. Фактам з'яўляецца тое, што неспрыяльны час і фармальныя перашкоды не дазволілі П. Мінкову атрымаць шэраг прэстыжных узнагарод і, відавочна, жаданага павышэння ў чыне.

**ЛІТАРАТУРА**

1. https: //be.wikipedia.org.
2. НГАБ у Гародні. Ф. 32. В. 2. Спр. 50.
3. НГАБ у Гародні. Ф. 32. В. 2. Спр. 116.

УДК 272(476.4)

## ЗАВЕДЫВАНИЕ И УПОТРЕБЛЕНИЕ ФУНДУШЕЙ К. МИРСКОГО И И. ГОРБАЦКОГО (1796-1845 ГГ.)

**Ганчар А. И.**
УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

Благодаря внушениям провинциала общества кармелитов босых Корнилия Мирского, 1 июля 1796 г. из доходов кармелитского монастыря, состоявшего в Минской губернии в м. Глубоком, ежегодно решено было отделять по 10 000 польских злотых, для содержания и воспитания при училищах 10 бедных дворянских детей, которых положено было выбрать преимущественно из фамилии Корсака, в память основателя Глубокского монастыря. Этим воспитанникам было решено давать одеяние, квартиру с отоплением и освещением, учебные книги, домашнего учителя, лекаря и лекарства. Новым провинциалом К. Мирским выделение 10 000 злотых перешло в разряд обязанностей монастыря. Отдавая всю справедливость благотворительным распоряжениям провинциала К. Мирского, основанном на добром согласии подчиненного ему общества кармелитов, 12 марта 1804 г. было получено высочайшее соизволение на обязательный характер отчислений 10 000 злотых из доходов кармелитского монастыря для содержания и воспитания при училищах 10 бедных дворянских детей [1, с. 210, ПСЗРИ-1, ст. 21208].